# Подпісы паўнамоцных прадстаўнікоў БССР пад Дагаворам аб утварэнні СССР

УДК 32 (476) «19» (092)



**Аляксей ЕЛІСЕЕЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

Аляксей ЕЛІСЕЕЎ. Подпісы паўнамоцных прадстаўнікоў БССР пад Дагаворам аб утварэнні СССР. У артыкуле прыводзяцца кароткія біяграфічныя звесткі пра ўсіх паўнамоцных прадстаўнікоў БССР, якія ад імя рэспублікі падпісалі Дагавор аб утварэнні СССР. Сярод удзельнікаў гэтай унікальнай падзеі былі дзеячы, імёны якіх увайшлі у гісторыю, а таксама асобы, знаёмыя сёння толькі вузкаму колу даследчыкаў альбо зусім невядомыя.
Ключавыя словы: БССР, паўнамоцны прадстаўнік, Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Дагавор аб утварэнні СССР.

Aliaksey YELISEYEU. Signatures of plenipotentiary representatives of the BSSR under the USSR Treaty. The article provides brief biographies of all plenipotentiary representatives of the BSSR who signed the USSR Treaty on behalf of the republic. Among them were both the historical figures and also the lesser-known people known only to a narrow circle of researchers or completely unknown.
Keywords: BSSR, plenipotentiary representative, Union of Soviet Socialist Republics, USSR Treaty.

Сто гадоў таму, 30 снежня 1922 года, быў створаны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік – дзяржава, без якой немагчыма ўявіць гісторыю XX стагоддзя. Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (БССР) была адной з краін – заснавальніц СССР разам з Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікай (РСФСР), Украінскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай (УССР) і Закаўказскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікай (ЗСФСР).

Пытанне аб узаемаадносінах савецкіх рэспублік і РСФСР абмяркоўвалася ў жніўні – кастрычніку 1922 года. Дзеля выпрацоўкі адпаведных рашэнняў Арганізацыйным бюро ЦК РКП(б) была ўтворана камісія, у склад якой уваходзілі выбраннікі ўсіх нацыянальных савецкіх рэспублік. БССР прадстаўляў старшыня ЦВК рэспублікі А.Р. Чарвякоў.

## ПРА АЎТАРА

ЕЛІСЕЕЎ Аляксей Барысавіч.

Нарадзіўся ў 1983 годзе ў г. Баранавічы Брэсцкай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2006), аспірантуру Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ (2009).

У 2006–2007 гадах працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства Косінскай СШ Лагойскага раёна Мінскай вобласці. З 2007 па 2009 год – начальнік аддзела грамадскага аб'яднання садзейнічання беларуска-расійскай інтэграцыі «Разам». З 2009 года – у сістэме вышэйшай адукацыі краіны: старшы выкладчык, дацэнт кафедры гуманітарных навук, дэкан Мінскага філіяла Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі. З 2015 года – намеснік дырэктара, з 2018 года – дырэктар Мінскага філіяла Расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя Г.В. Пляханава.

Кандыдат гістарычных навук (2010), дацэнт (2020).

Аўтар больш як 60 навуковых прац і публікацый, у тым ліку адной манаграфіі.

Сфера навуковых інтарэсаў: гістарыяграфія, палітычная і сацыяльная гісторыя БССР і СССР.

Для разгляду камісіяй народны камісар па справах нацыянальнасцей РСФСР І.В. Сталін падрыхтаваў праект, згодна з якім Украіна, Беларусь, Азербайджан, Арменія і Грузія павінны былі стаць аўтаноміямі ў складзе РСФСР. З папраўкай Чарвякова, які прапанаваў абавязкова заключаць паміж рэспублікамі і РСФСР дагаворы аб уваходжанні ў склад апошняй, праект Сталіна быў ухвалены членамі камісіі. Але, як вядома, ён быў раскрытыкаваны шэрагам партыйных і савецкіх работнікаў рэспублік, а таксама У.І. Леніным, пад уплывам якога быў выпрацаваны іншы падыход да аб'яднання рэспублік: «Прызнаць неабходным заключэнне дагавора паміж Украінай, Беларуссю, Федэрацыяй Закаўказскіх Рэспублік і РСФСР аб аб'яднанні іх у „Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік" з пакіданнем за кожнай з іх права свабоднага выхаду са складу „Саюза"» *[1, с. 206]*.

Наступным крокам стаў разгляд гэтай прапановы на рэспубліканскіх з'ездах Саветаў. IV Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся 14–18 снежня 1922 года, падтрымаў утварэнне СССР і зацвердзіў «Асноўныя пункты Канстытуцыі Саюза Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік (РСФСР, Украіны, Беларусі, Закаўказскай Федэрацыі)» *[2, с. 2]*.

Пытанне аб утварэнні СССР абмяркоўвалася 23–27 снежня 1922 года на X Усерасійскім з'ездзе Саветаў, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх рэспублік. Ад імя БССР выступіў А.Р. Чарвякоў, які сказаў: «Беларуская дэлегацыя, якая прыбыла сюды па даручэнню IV Усебеларускага з'езда Саветаў, упаўнаважыла мяне заявіць вам, што рабочыя і сяляне Беларусі ў асобе свайго IV Усебеларускага з'езда Саветаў адзінагалосна пастанавілі ўвайсці ў Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік…» *[3, с. 196]*.

29 снежня 1922 года ў Крамлі адбылася канферэнцыя паўнамоцных дэлегацый рэспублік, якая зацвердзіла праекты Дэкларацыі і Дагавора аб утварэнні СССР, а на наступны дзень, 30 снежня, у Вялікім тэатры пачаўся I з'езд Саветаў СССР, удзел у якім узялі дэлегацыі, вылучаныя з'ездамі Саветаў РСФСР, УССР, ЗСФСР і БССР. Агульная колькасць удзельнікаў з'езда склала больш за дзве тысячы чалавек. Рашаючы голас мелі 1673 дэлегаты, з іх 23 прадстаўлялі БССР *[4, с. 1]*. Дэлегаты I з'езда Саветаў СССР зацвердзілі Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Прадугледжвалася працэдура заключэння дагавора, згодна з якой прадстаўнікі рэспублік павінны былі замацаваць дакумент сваімі подпісамі. Каб захаваць раўнапраўе, ад кожнай рэспублікі падпісаць дагавор павінны былі паўнамоцныя прадстаўнікі ў колькасці, не большай за колькасць беларускай дэлегацыі як самай меншай. Таму пад дагаворам стаяць па 23 подпісы ад УССР, ЗСФСР, БССР і 17 ад РСФСР. Гэта подпісы вядомых

**Подпісы членаў паўнамоцных дэлегацый рэспублік пад Дагаворам аб утварэнні СССР**


ПОДПИСАЛИ
члены полномочных делегаций от:

РСФСР | УССР | ЗСФСР | БССР

дзеячаў савецкай дзяржавы: М.І. Калініна, І.В. Сталіна, А.І. Рыкава, А.С. Енукідзэ, А.Д. Цюрупы, Р.Л. Пятакова, Р.К. Арджанікідзэ, Р.І. Пятроўскага, М.В. Фрунзэ, С.М. Кірава, М.А. Скрыпніка і інш.

Ніжэй падаецца інфармацыя пра ўсіх удзельнікаў падпісання Дагавора аб утварэнні СССР з беларускага боку. Звесткі пра паўнамоцных прадстаўнікоў БССР прадстаўлены ў парадку размяшчэння іх подпісаў пад дагаворам *[5, арк. 1–2]*. Разам з дзеячамі, імёны якіх шырока вядомы, сярод падпісантаў былі і асобы, знаёмыя сёння альбо толькі вузкаму колу даследчыкаў, альбо зусім невядомыя.

Першым свой подпіс паставіў чалавек, з імем якога непарыўна звязаны першыя васямнаццаць гадоў гісторыі Савецкай Беларусі, – старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў (1892–1937). З 1917 года ён прымаў актыўны ўдзел у беларускім нацыянальным руху, быў членам Беларускай сацыялістычнай грамады, адным з арганізатараў Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, у маі 1917 года ўступіў у партыю бальшавікоў. У снежні 1917-га Чарвякоў быў удзельнікам Усебеларускага з’езда, а ў лютым 1918-га ўзначаліў Беларускі нацыянальны камісарыят. А. Чарвякоў браў удзел у абодвух абвяшчэннях Савецкай Беларусі: яго подпіс стаіць пад Маніфестам Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі аб абвяшчэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі 1 студзеня 1919 года і пад Дэкларацыяй аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі 31 ліпеня 1920 года. У снежні 1920 года Чарвякоў быў абраны старшынёй ЦВК БССР і займаў гэту пасаду да канца жыцця. Гэтаксама з 1920 па 1937 год Чарвякоў уваходзіў у вышэйшае кіраўніцтва Кампартыі Беларусі. На І з’ездзе Саветаў СССР, 30 снежня 1922 года, быў абраны сустаршынёй ЦВК СССР. З пачатку 1930-х гадоў Аляксандр Чарвякоў неаднойчы падвяргаўся палітычнаму цкаванню, быў аб’яўлены нацыянал-апартуністам, але кожны раз прызнаваў свае «памылкі» і заставаўся на пасадзе. Чарговы раз быў жорстка раскрытыкаваны на XVI з’ездзе КП(б)Б, застрэліўся ў перапынку паміж пасяджэннямі з’езда *[6]*.


**Аляксандр Чарвякоў**

Другі подпіс пад Дагаворам аб утварэнні СССР паставіў ад імя БССР Шэпшэль Шэпшэлевіч Ходаш (1896–1951) – старшыня Савета прафесійных саюзаў Беларусі, член Прэзідыума Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. Сталяр па прафесіі, Ш. Ходаш адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ўзначаліў прафесійны саюз дрэваапрацоўшчыкаў у Мінску. У лютым 1918 года, пасля таго як кіраўнікі Аблвыкамзаха і Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) эвакуіраваліся ў Смаленск, Ходаш быў адным са стваральнікаў і кіраўнікоў падпольнай арганізацыі РКП(б) у Мінску. Савет прафесійных саюзаў Беларусі ён узначальваў з 1920 па 1925 год, адначасова з’яўляўся членам кіраўнічых органаў КП(б)Б і членам ЦВК БССР. У канцы 1925 года Ходаша адправілі вучыцца ў Камуністычную акадэмію, і больш у БССР ён не вяртаўся. У Маскве ўзначальваў Усесаюзны трэст па будаванню заводаў апрацоўкі лёну і канапель, ільнаводчых і канапляводчых саўгасаў, у 1930–40-я гады працаваў у камісарыятах фінансаў і земляробства СССР. Быў узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны», медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» *[7, арк. 11–15]*.


**Шэпшэль Ходаш**

Трэцім ад БССР дагавор падпісаў Пракоп Дзянісавіч Малаковіч (1895–1937) – народны камісар унутраных спраў БССР і член Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. З 1912 года П. Малаковіч быў у партыі эсэраў, у 1917-м далучыўся да бальшавікоў. Падчас нямецкай акупацыі ў 1918 годзе – адзін з арганізатараў партызанскага руху, камандзір партызанскага атрада, член Рудабельскага і Бабруйскага падпольных камітэтаў РКП(б). У 1919 годзе ўваходзіў у Савет абароны Бабруйскага павета. У сакавіку 1919 года рэвалюцыйны атрад на чале з Малаковічам удзельнічаў у падаўленні гэтак званага


**Пракоп Малаковіч**

Стракапытаўскага паўстання ў Гомелі. У 1920 годзе Малаковіч узначаліў Бабруйскі павятовы выканкам, пазней атрымаў пасаду народнага камісара ўнутраных спраў БССР, але неўзабаве быў накіраваны на пасаду старшыні Амурскага губрэўкама і выканкама. У 1927 годзе П. Малаковіч вярнуўся ў БССР і ўзначаліў Гомельскі акруговы выканаўчы камітэт, быў сакратаром Гомельскага акруговага камітэта КП(б)Б. У 1930-я гады – намеснік наркама сувязі СССР. Расстраляны ў 1937 годзе *[8, арк. 42]*.



Адам Славінскі

Чацвёрты подпіс паставіў чалавек, імя якога ў БССР у 1920-я гады было сімвалам легендарнасці, – Адам Сямёнавіч Славінскі (1885–1937), на момант падпісання дагавора народны камісар земляробства БССР і член Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. Сапраўднае прозвішча А. Славінскага – Качароўскі. Ён уступіў у Сацыял-дэмакратыю Каралеўства Польскага і Літвы ў 1907-м, у гэтым жа годзе быў першы раз арыштаваны, у 1909-м – другі раз. Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года Качароўскі камандаваў у Петраградзе атрадамі Чырвонай гвардыі, якія авалодалі Варшаўскім вакзалам і бралі ўдзел у штурме Зімняга палаца. У пачатку 1918-га Качароўскага накіравалі ў Мінск, дзе ён быў вымушаны хутка сысці ў падполле і ўзяць псеўданім Славінскі. Падчас нямецкай акупацыі Беларусі быў адным з кіраўнікоў Мінскай падпольнай арганізацыі РКП(б). Са студзеня 1920 года – арганізатар партызанскага руху супраць палякаў у Мінскай губерні. Са снежня 1921 па сакавік 1924 года быў народным камісарам земляробства БССР. З 1924-га па даручэнні ЦК КП(б)Б актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйна-камуністычным руху Заходняй Беларусі, узначальваў Бюро дапамогі КПЗБ. У 1920–30-я гады быў членам ЦК трох кампартый: КП(б)Б, КПЗБ і Кампартыі Польшчы. У лютым 1928 года пастановай Прэзідыума ЦВК БССР быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Расстраляны ў 1937 годзе *[9]*.

Пяты подпіс пад Дагаворам аб утварэнні СССР належыць намесніку старшыні Савета народнай гаспадаркі Беларусі, члену Цэнтральнага Бюро КП(б)Б Мордуху Ельевічу Міленькаму (1887–?). Па прафесіі М. Міленькі быў пекарам-булачнікам. Мабілізаваны ў 1914 годзе, служыў артылерыстам. У РКП(б) уступіў у лютым 1918-га. У 1920–1923 гадах быў членам Прэзідыума Савета прафесійных саюзаў Беларусі і ўзначальваў прафесійны саюз харчавікоў. У 1922 годзе прызначаны намеснікам старшыні Савета народнай гаспадаркі Беларусі. У лютым – верасні 1922-га – народны камісар працы БССР. З 1924 года – намеснік кіраўнічага, кіраўнічы Прамбанкам. На працягу 1920-х гадоў неаднойчы выбіраўся членам ЦВК БССР *[8, арк. 45; 10, арк. 1–2]*.

Шостым прадстаўніком, які падпісаў дагавор, стаў народны камісар фінансаў БССР Станіслаў Якаўлевіч Талунціс (1890–?). С. Талунціс па прафесіі быў рахункаводам, працаваў бухгалтарам, загадчыкам казначэйства ў кампаніі «Зінгер» у Падольску. З 1914 года знаходзіўся на фронце. Член РКП(б) са снежня 1919-га. У 1920–1922 гадах – намеснік наркама фінансаў, наступныя два гады – народны камісар фінансаў БССР. Пад яго кіраўніцтвам ажыццяўляліся грашовая рэформа, перабудова фінансавай і бюджэтнай сістэм пад патрэбы новай эканамічнай палітыкі. У лютым 1924 года С. Талунціс уваходзіў у склад камісіі СНК БССР па прыёмцы тэрыторый, якія пасля ўзбуйнення далучаліся да БССР, а ў сакавіку быў прызначаны фінансавым саветнікам урада СССР пры ўрадзе Мангольскай Народнай Рэспублікі. У 1926–1927 гадах кіраваў Карэльскай канторай Дзяржаўнага банка СССР *[8, арк. 69]*.

Пачынаючы з сёмага аўтографа, пад Дагаворам аб утварэнні СССР з'яўляюцца подпісы прадстаўнікоў усіх шасці паветаў БССР: Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мінскага, Мазырскага і Слуцкага.

Сёмым паставіў подпіс сакратар Барысаўскага павятовага камітэта КП(б)Б Уладзімір Маркавіч Путнін (1896–1938). Латыш па нацыянальнасці – Вальдэмарас Путнінс – быў паштова-тэлеграфным работнікам. Падчас Першай сусветнай вайны служыў на Паўночным фронце, узнагароджаны Георгіеўскім крыжам IV ступені. З лістапада 1917 года – член Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Школы прапаршчыкаў Паўночнага фронту. Пазней быў адказным сакратаром Пензенскага губкама РКП(б). У студзені 1922 года апынуўся ў Мінску, стаў членам Праўлення Беларускага цэнтральнага саюза спажывецкіх таварыстваў (Цэнтрбелсаюза). З лістапада

1922 па кастрычнік 1923 года Путнін працаваў сакратаром Барысаўскага павятовага камітэта КП(б)Б, потым узначальваў Ляхаўскі райкам КП(б)Б г. Мінска і быў членам ЦК КП(б)Б. Вясной 1924 года Путніна адклікалі з БССР. Далей працаваў на пасадах сакратара Сталінградскага, Растоўскага, Паўночна-Каўказскага, Курскага, Мардоўскага камітэтаў УсеКП(б). Расстраляны ў 1938 годзе *[8, арк. 70]*.

Восьмы падпісант – яшчэ адзін прадстаўнік Барысаўскага павета, старшыня павятовага бюро прафесійных саюзаў Бенцыян Пейсахавіч Эпштэйн (1894–?). Б. Эпштэйн атрымаў хатнюю адукацыю, па прафесіі шавец. З 1915 года – радавы на фронце. Яшчэ ў 1913 годзе Эпштэйн уступіў у Бунд, а з лютага 1919 года – член РКП(б). З 1925 года працаваў старшынёй Магілёўскага акруговага бюро прафесійных саюзаў *[11, арк. 1–3]*.

Дзявятым падпісаў Дагавор аб утварэнні СССР старшыня бюро прафесійных саюзаў Слуцкага павета Акім Абрамавіч Шалаховіч (1898–1938). Самы малады сярод прадстаўнікоў ад БССР, якому было на той час 24 гады. Па прафесіі слесар, з 1915 года А. Шалаховіч з'яўляўся членам Бунда, у 1920-м уступіў у РКП(б). У 1920 годзе быў у Чырвонай арміі. Узначальваў бюро прафесійных саюзаў у Ваўкавыску, Слуцку, потым працаваў старшынёй Віцебскага акруговага савета прафсаюзаў. У 1927 годзе – член Прэзідыума і загадчык тарыфна-эканамічнага аддзела Цэнтральнага Савета прафесійных саюзаў БССР, член ЦВК БССР. З 1928 года займаўся прафсаюзнай дзейнасцю ў г. Навасібірску. Вядома, што ў 1937 годзе А. Шалаховіч быў старшынёй Навасібірскага савета прафсаюзаў. Расстраляны ў 1938 годзе *[8, арк. 80; 12, арк. 357–358]*.

Дзясятым падпісаў дагавор Аляксей Ананьевіч Нікіцін (1889–?) – на той час адказны сакратар Ігуменскага павятовага камітэта КП(б)Б. Па прафесіі пераплётчык. Да партыі бальшавікоў далучыўся ў 1916 годзе. З сакавіка 1923 па люты 1924 года – кандыдат у члены Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. У 1926 годзе – намеснік народнага камісара Рабоча-сялянскай інспекцыі БССР *[8, арк. 51]*.


**Зміцер Чарнушэвіч**

Адзінаццаты подпіс належыць старшыні Ігуменскага выканаўчага камітэта Зміцеру Сілычу Чарнушэвічу (1882–1938). Усе мужчыны з яго сям'і былі рэвалюцыянерамі. З 1900 года З. Чарнушэвіч з'яўляўся членам арганізацыі эсэраў, праз тры гады далучыўся да РСДРП. У 1904 годзе эміграваў у ЗША, а ў наступным – вярнуўся. Падчас нямецкай акупацыі 1918 года – член падпольнага Слуцкага камітэта РКП(б), быў арыштаваны за бальшавіцкую прапаганду і некалькі месяцаў правёў у канцэнтрацыйным лагеры. У верасні 1918 года пераехаў у Маскву, працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце. У студзені 1919-га – камісар сацыяльнага забеспячэння Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі. З лютага 1922 года – старшыня Ігуменскага выканкама. У сакавіку – жніўні 1924 года быў народным камісарам унутраных спраў БССР. У 1924–1927 гадах – член Прэзідыума і сакратар ЦВК БССР, старшыня Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР. Адзін з арганізатараў беларусізацыі дзяржаўных, партыйных і грамадскіх устаноў рэспублікі. У жніўні 1927 года Чарнушэвіча прызначылі старшынёй Праўлення Дзяржстраха БССР. У 1931–1936 гадах працаваў намеснікам дырэктара Інстытута літаратуры і мовы АН БССР. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца беларускамоўныя кнігі, на якіх пазначана: «Пераклаў з рускай мовы З. Чарнушэвіч». Расстраляны ў 1938 годзе *[13, арк. 1–8; 14]*.

Пра дванаццатага падпісанта Дагавора аб утварэнні СССР, як і пра шэраг іншых, вядома зусім няшмат. Гэта Бенцыян Лейбавіч Бухман (1888–?) – старшыня бюро прафесійных саюзаў Мазырскага павета і член павятовага камітэта КП(б)Б. Яшчэ вядома, што ў сярэдзіне 1920-х гадоў Б. Бухман працаваў у народным камісарыяце працы БССР *[8, арк. 12]*.

Трынаццатым паставіў свой подпіс пад дагаворам Адольф Хрыстафоравіч Гетнэр (1887–1938) – народны камісар юстыцыі і пракурор БССР, старшыня Выканаўчага камітэта Мінскага савета дэпутатаў, член Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. Паходзіў А. Гетнэр з Курляндскай губерні. З 1904 года – член Сацыял-дэмакратыі Латышскага краю, удзельнік рэвалюцыі 1905–1907 гадоў. Падчас рэвалюцыйных падзей 1917-га знаходзіўся ў Смаленску. Пасля

Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзначальваў губернскі аддзел юстыцыі, а потым і аддзел юстыцыі Аблвыкамзаха. У 1921–1924 гадах – наркам юстыцыі і пракурор БССР. У пачатку 1920-х гадоў Гетнэр быў намеснікам старшыні ЦВК і СНК БССР, членам і кароткі час сакратаром ЦБ КП(б)Б. Узначальваў кантрольную камісію КП(б)Б. Падчас унутрыпартыйнай дыскусіі ў 1923 годзе Гетнэр аб'яўлены галоўным фракцыянерам і прыхільнікам Троцкага ў КП(б)Б, за што пазней быў накіраваны на нізавую пасаду сакратара Шклоўскага райкама КП(б)Б. У 1925 годзе быў адклікаіны з БССР, але з 1932 года ізноў працаваў у Беларусі – намеснікам наркама рабоча-сялянскай інспекцыі і старшынёй Магілёўскай раённай кантрольнай камісіі. У 1935–1937 гадах – пракурор Карэльскай, потым Мардоўскай АССР. Член канстытуцыйнай камісіі па распрацоўцы Канстытуцыі СССР (1936). Расстраляны ў 1938 годзе *[15, арк. 1–6]*.


Ян Фабрыцыус

Пра чатырнаццатага падпісанта ў савецкія гады складалі вершы і песні як пра легендарнага камбрыга. Гэта першы кавалер чатырох ордэнаў Чырвонага Сцяга Ян Фрыцавіч Фабрыцыус (1877–1929). За рэвалюцыйную дзейнасць Я. Фабрыцыус больш за дзесяць гадоў правёў на катарзе і ў ссылцы. З 1915 года ў арміі, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 года. Камандаваў чырвонагвардзейскімі атрадамі падчас барацьбы супраць нямецкіх і польскіх войск у 1918–1920 гадах. У чэрвені 1920 года на чале 48-й брыгады 16-й стралковай дывізіі прыбыў у Полацк. Адсюль 4 ліпеня брыгада пачала наступленне на палякаў і дайшла да р. Віслы. У студзені 1921 года Фабрыцыус стаў начальнікам і камісарам 43-х аб'яднаных курсаў каманднага саставу Чырвонай арміі, якія размяшчаліся ў Полацку. Пасля расфарміравання курсаў у канцы 1922 года прызначаны начальнікам і камісарам 81-х пяхотных курсаў камсаставу Чырвонай арміі ў Мінску, камандзірам 2-й Беларускай стралковай дывізіі. У кастрычніку 1923 года з'ехаў з БССР, але ў 1927-м Фабрыцыуса накіравалі ў Беларусь на пасаду камандзіра 4-га стралковага корпуса, які знаходзіўся ў Віцебску. У красавіку наступнага года накіраваны на працу ў Тбілісі. Загінуў у 1929 годзе *[8, арк. 71]*.


Аляксандр Хацкевіч

Пятнаццаты подпіс належыць старшыні Барысаўскага павятовага выканаўчага камітэта Аляксандру Ісакавічу Хацкевічу (1895–1937). Ён паходзіў з Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1915 годзе быў мабілізаваны, пасля ранення ў 1918-м вярнуўся ў Барысаў. Член партыі бальшавікоў з 1917 года. Падчас польскай акупацыі Беларусі быў у партызанах, кіраваў партызанскімі групамі. Са снежня 1920 года ўзначальваў Барысаўскі выканкам, з 1924-га – Магілёўскі акруговы выканкам. З другой паловы 1920-х гадоў – народны камісар унутраных спраў БССР, пастаянны прадстаўнік урада БССР пры ўрадзе СССР, сакратар ЦВК БССР і старшыня Нацыянальнай камісіі ЦВК. Прыхільнік і актыўны ўдзельнік палітыкі беларусізацыі. З 1931 па 1935 год – народны камісар фінансаў БССР, наступныя два гады – сакратар Савета нацыянальнасцей ЦВК СССР. Як і Чарвякоў, з 1920 па 1937 год быў членам ЦВК БССР. З 1922 года ўваходзіў у цэнтральныя кіраўнічыя органы КП(б)Б. Расстраляны ў 1937 годзе *[16, арк. 1–6]*.

Членам Барысаўскага павятовага выканаўчага камітэта з'яўляўся і шаснаццаты прадстаўнік беларускай дэлегацыі Нічыпар Лукіч Аксючыц (1892–1939). У 1914 годзе ён быў мабілізаваны, ваяваў на Заходнім фронце. Удзельнічаў у салдацкім руху, быў членам палкавога камітэта. У 1917–1918 гадах – член выканкама Барысаўскага Савета, член рэўкама. З 1923-га – арганізатар і старшыня праўлення Беларускага сельска-гаспадарчага банка, у 1928–1929 гадах – наркам гандлю БССР, з 1929 па 1931 год – старшыня Мінскага акруговага выканкама, старшыня Мінскага гарвыканкама. У 1931–1932 гадах – наркам камунальнай гаспадаркі БССР. У сярэдзіне 1930-х гадоў жыў у г. Куйбышаве, дзе кіраваў мясцовай канторай Сельгасбанка. У 1937 годзе быў арыштаваны. Паводле некаторых звестак, загінуў у 1939 годзе *[8, арк. 4; 17, арк. 1–3]*.

Тры наступныя аўтографы пад дагаворам пакінулі старшыня Бабруйскага павятовага выканаўчага камітэта Леў Барысавіч Ліакумовіч (1875–?), які па ўзросце быў самым старэйшым з падпісантаў (47 гадоў) *[8, арк. 37]*; старшыня Слуцкага павятовага выканаўчага камітэта Мікалай Васільевіч Уладзіміраў (1890–?) *[8, арк. 14]*; адказны сакратар Мазырскага павятовага камітэта КП(б)Б Аляксей Якаўлевіч Бабенка (1895–?) *[8, арк. 11]*. Больш падрабязную інфармацыю пра іх знайсці пакуль не ўдалося.



Леў Ліакумовіч

Дваццатым распісаўся Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі (1881–1931) – народны камісар асветы БССР. У. Ігнатоўскі скончыў Юр'еўскі ўніверсітэт, доўгі час быў членам партыі эсэраў. У 1920 годзе стварыў Беларускую камуністычную арганізацыю, ад імя якой 31 ліпеня падпісаў Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі. У лістападзе 1924 года зацверджаны загадчыкам агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦК КП(б)Б і ўведзены ў склад Бюро ЦК. У 1920-я гады займаў шэраг высокіх пасад у партыйных і дзяржаўных органах: народны камісар асветы БССР (1920–1926), старшыня Прэзідыума Інстытута беларускай культуры (1925–1928). З 1928 па 1931 год – першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук. Аказваў значны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай і культурнай палітыкі ў нашай рэспубліцы. У 1930 годзе быў аб'яўлены адным з лідараў нацыянал-апартунізму ў КП(б)Б, абвінавачваўся ў нацыянал-дэмакратызме. 16 студзеня 1931 года быў выключаны з партыі, а 4 лютага скончыў жыццё самагубствам *[18, арк. 1–7]*.



Усевалад Ігнатоўскі

Дваццаць першы подпіс пад дагаворам належыць паўнамоцнаму прадстаўніку БССР пры ўрадзе РСФСР Міхасю Іванавічу Марозу (1893 – пасля 1944). Ён вучыўся ў Мінскім настаўніцкім інстытуце, у 1915 годзе разам з інстытутам эвакуіраваўся ў Яраслаўль. Прымаў удзел у дзейнасці Яраслаўскай беларускай рады. У 1918–1919 гадах працаваў у аддзеле Белнацкама, які займаўся справамі бежанцаў, у кастрычніку 1920 года выконваў абавязкі наркама асветы Савецкай Беларусі. З сакавіка 1921 па жнівень 1924 года – паўнамоцны прадстаўнік БССР пры ўрадзе РСФСР і СССР. Наступныя тры гады быў кіраўніком спраў СНК БССР. У канцы 1928 года вызвалены ад пасады, абвінавачаны ў антыдзяржаўнай дзейнасці, у 1929 годзе выключаны з партыі. З'ехаў на Далёкі Усход. У 1940 годзе быў арыштаваны і асуджаны, вызвалены ў 1942-м. З 1944 года звесткі аб ім губляюцца *[8, арк. 47; 19, арк. 1–4]*.



Міхась Мароз

Дваццаць другім прадстаўніком БССР быў Вацлаў Пятровіч Грузель (1884–1937) – старшыня Мінскага павятовага выканаўчага камітэта. Подпіс Грузеля пад дагаворам адметны – ён адзіны напісаны лацінскімі літарамі: W. Gruzel. У 1906 годзе В. Грузель далучыўся да Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы. Тры гады правёў у турме за рэвалюцыйную дзейнасць. З сакавіка 1918 па чэрвень 1921 года – у Чырвонай арміі: камісар палка, дывізіі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. З 1921 па 1925 год – старшыня Мінскага, потым Бабруйскага павятовых выканаўчых камітэтаў, народны камісар Рабоча-сялянскай інспекцыі БССР і старшыня ЦКК КП(б)Б. У 1925 годзе па ўласным жаданні быў адкліканы з БССР. Працаваў у Цвяры, на Паўночным Каўказе, у Яраслаўлі, Іркуцку. Расстраляны ў 1937 годзе *[8, арк. 18; 20, арк. 1–2]*.

Апошні, дваццаць трэці подпіс паставіў пад Дагаворам аб утварэнні СССР Іосіф Ільіч Марон (1896–?) – член Бабруйскага павятовага камітэта КП(б)Б. Адзіны з дэлегацыі, хто на IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў быў абраны не членам, а кандыдатам у члены ЦВК БССР. Яшчэ захаваліся звесткі, што ў 1924 годзе ён працаваў намеснікам старшыні Белпайгандлю *[8, арк. 43]*.



Вацлаў Грузель

Усе паўнамоцныя прадстаўнікі БССР, якія ўдзельнічалі ў падпісанні Дагавора аб утварэнні СССР, з'яўляліся членамі РКП(б). На IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў усе яны былі абраны ў склад Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР (акрамя І. Марона). Урадавыя структуры Савецкай Беларусі прадстаўлялі сем чалавек, у тым ліку старшыня СНК, пяць народных камісараў, намеснік старшыні Савета народнай гаспадаркі (Чарвякоў, Малаковіч, Славінскі, Талунціс, Гетнэр, Ігнатоўскі, Міленькі). Дзесяць чалавек прадстаўлялі рэгіёны рэспублікі – павятовыя выканкамы альбо павятовыя партыйныя камітэты (Чарнушэвіч, Хацкевіч, Аксючыц, Ліакумовіч, Грузель, Путнін, Нікіцін, Уладзіміраў, Бабенка, Марон), чатыры – прафесійныя саюзы (Ходаш, Эпштэйн, Шалаховіч, Бухман), адзін – Чырвоную армію (Фабрыцыус) і адзін ажыццяўляў сувязь паміж урадамі БССР і РСФСР (Мароз). Па нацыянальнасці сярод іх было сем беларусаў, сем яўрэяў, тры латышы, два рускія, два палякі, адзін літовец і адзін украінец. Наперадзе іх чакалі розныя, у большасці трагічныя лёсы, а некаторых забыццё. Аднак 30 снежня 1922 года ўсе яны стаялі на парозе новага жыцця, і не толькі ў пераносным, але і ў прамым сэнсе ўласнай рукой пісалі новую старонку гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

***Выкарыстаны ілюстрацыйныя матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, часопісаў «Полымя», «Маладосць» і з адкрытых крыніц***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 28.10.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Из истории образования СССР // Известия ЦК КПСС. – 1989. – № 9. – С. 191–218.
2. Змены ў Канстытуцыі БССР // Савецкая Беларусь. – 1922. – 21 снеж.
3. Десятый Всероссийский съезд Советов рабочих, крестьянских, красноармейских и казачьих депутатов (23–27 декабря 1922 года): стенографический отчет с приложениями / ВЦИК. – М.: ВЦИК, 1923. – 226 с.
4. I Союзный съезд Советов. Состав съезда ССР // Известия. – 1923. – 31 дек. – 1 янв.
5. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). – Ф. Р-3316. Воп. 1. Спр. 5.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 489.
7. ДАРФ. – Ф. А539. Воп. 4. Спр. 9780.
8. НАРБ. – Ф. 541. Воп. 1. Спр. 1.
9. Досин, М.И. А.С. Славинский: страницы биографии / М.И. Досин, П.А. Селиванов. – Минск: Беларусь, 1989. – 80 с.
10. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 311.
11. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 516.
12. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1690.
13. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 2. Спр. 5974.
14. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 491.
15. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 111.
16. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 474.
17. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 11.
18. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 2. Спр. 178.
19. НАРБ. – Ф. 175. Воп. 14. Спр. 5.
20. ДАРФ. – Ф. А539. Воп. 4. Спр. 6247.